УДК 811.161.3'373.6

Касмонімы ў легендзе "Мірадж": праблемы этымалогіі

Несцяровіч В.І.
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск

У легендзе "Мірадж" з Кітаба А. Хасяневіча (1832) аб нябесным падарожжы прарока Мухамеда да Боскага трона для абазначэння наведаных ім сямі нябёсаў выкарыстана арабская лексіка. Высвятленне матывацыйнай прыметы гэтых назваў складае змест публікацыі. У выніку праведзенага назірання высветлілася, што большасць касмонімаў этымалагізуецца, матывацыйныя прыметы назваў пятага (Сафы), шостага (Халіса), сёмага (Фаўка), а таксама, з пэўнай агаворкай, чацвёртага (Мазіна) і, магчыма, першага (Рафа) нябёсаў дастаткова празрыстыя. Выбар найменняў у гэтых выпадках абумоўлены галоўным чынам найбольш выразнымі, кідкімі прыметамі, якімі характарызуюцца нябёсы або прадметы, што там знаходзяцца, а таксама ўражаннем наведвальніка і месцам, размяшчэннем аднаго неба адносна другога.
У публікацыі прыводзіцца таксама этымалагічная даведка арабскай назвы варотаў на першым небе (Хафіз).
Ключавыя словы: *кітаб, легенда "Мірадж", касмонімы, арабізмы, цюркская мова, беларуская мова, арабская мова, значэнне слова.*

(Ученые записки. – 2013. – Том 15. – С. 131–136)

Astronyms in the Legend of Mi'rağ: Problems of Etymology

Nesterovich V.I.
Educational establishment "Vitebsk State University named after P.M. Masherov", Vitebsk

For the description of the seven circles of heaven in the legend "Mi'rağ" from the Kitab written by A. Khasianyevich in 1832 about the ascension of Prophet Muhammad into heaven Arabic vocabulary is used. Finding out the motivational indications of these names makes up the contents of this publication. The research work revealed the fact, that the main part of the astronyms has been etymologized, the motivational indications of the names for the fifth (Safi), sixth (Halisa), seventh (Fawqa) and with the proviso for the fourth (Mezina), and perhaps for the first (Rafa) heaven are quite transparent. The choice of the names in these cases is determined mainly by the most expressive catchy signs, which characterize heaven or objects there, by the impressions of the visitor as well, by the location of one heaven to another too. The etymology reference about the Arabic name for the gates on the first heaven (Hafiz) is also made in this publication.
Key words: *Kitab, "Mi'rağ" legend, astronyms, Arabisms, Turkic language, Byelarusian, Arabic, meaning of the word.*

(Scientific notes. – 2013. – Vol. 15. – P. 131–136)

Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: nescerka@yahoo.com – **В.І. Несцяровіч**

Словам "мірадж" (ар. *miʻrağ* 'лесвіца, узыходжанне') абазначаецца дзівоснае перанясенне прарока Мухамеда з Меккі ў Іерусалім і адтуль да Боскага трона. Пра гэтыя два факты з жыцця заснавальніка ісламу паведамляецца ў літаратурным творы, які дайшоў да нас у кітабах "літоўскіх" татар і таксама атрымаў назву "Мірадж". Традыцыйна ён лічыцца легендай, хаця мае канкрэтнага аўтара [1, с. 369].

Легенда "Мірадж" была асабліва папулярнай у арабскай і персідскай літаратурах, а з прыняццем туркамі ісламу – і ў турэцкай класічнай і народнай літаратуры [1, с. 357]. З устанаўленнем трывалых сувязей паміж "літоўскімі" татарамі і Турцыяй гэты твор разам з іншай рэлігійнай літаратурай трапляе на этнічныя беларускія землі, дзе і ажыццяўляецца яго пераклад з цюркскай мовы на беларускую. Самай даўняй з вядомых з'яўляецца копія ў Кітабе Івана Луцкевіча 1-й паловы XVIII ст. Перакладзеная на беларускую мову легенда сустракаецца яшчэ ў некалькіх кітабах і падаецца сінхронна з цюркскім тэкстам або без яго. Апавяданне пра нябеснае падарожжа прарока Мухамеда ёсць і ў Кітабе А. Хасяневіча (1832), які і паслужыў крыніцай моўных матэрыялаў для гэтай публікацыі.

Паводле легенды з Кітаба А. Хасяневіча, прарок Мухамед на працягу ночы быў перанесены з Меккі ў Ерусалім, а адтуль на казачнай істоце па імені аль-Бурак здзейсніў узыходжанне на нябёсы, наведаў рай і пекла, меў размову з Алахам. Потым архангел Джабраіл вярнуў Мухамеда на зямлю, а аль-Бурак хутка перанёс Прарока ў Мекку. Пра сваё цудоўнае ўзыходжанне Мухамед расказвае чатыром праведным халіфам, якія без усякага сумнення паверылі ў яго начное падарожжа.

Характар і паходжанне твора абумовілі пранікненне ў мову беларускай копіі пэўнай колькасці арыенталізмаў, у прыватнасці арабізмаў, якімі абазначаюцца назвы *нябёсаў*. У лінгвістычнай літаратуры, прысвечанай вывучэнню кітабаў, створаных у Беларусі, значэнні касмонімаў не тлумачацца, чым і абумоўлена актуальнасць публікацыі. Мэта артыкула – этымалагізацыя касмонімаў, выкарыстаных у легендзе "Мірадж".

Матэрыял і метады. Матэрыялам для назірання сталі арабскія назвы, дадзеныя нябёсам. У працэсе збору і аналізу фактычнага матэрыялу выкарыстоўваліся метады суцэльнага выяўлення, дэскрыптыўны, інтэрпрэтацыйны, супастаўляльны.

Вынікі і іх абмеркаванне. Галіна Мішкінене і Хусейн Дургут, супастаўляючы цюркскі і беларускі варыянты легенды, адзначаюць, што пералік і назвы сямі нябесных сфер і матэрыялу, з якога яны зроблены, характэрны для легенды "Мірадж". Але не ўсе назвы нябёсаў у кітабах "літоўскіх" татар супадаюць з адпаведнымі найменнямі ў старатурэцкіх тэкстах, якія бытавалі ў Турцыі. Напрыклад, другое неба ў Кітабе Луцкевіча называецца nāʻūre, а ў "Лалелі-II" (тэкст, які ўзнік у Турцыі на рубяжы XIV–XV стст.) – ahaz, трэцяе неба ў Кітабе Луцкевіча – zāʻire, а ў "Лалелі-II" – eiberā [1, с. 367–368].

Не дзіўна, што назвы нябёсаў у старатурэцкім тэксце, які ўзнік і бытаваў у Турцыі, цюркскія. Некалькі дзіўным падаецца тое, што ў цюркскай частцы легенды з Кітаба Хасяневіча – назвы арабскія. Магчыма, гэта тлумачыцца, акрамя ўсяго, і тым, што з прыняццем ісламу цюркскія мовы запазычылі вялікую колькасць арабскіх лексем і арабскія назвы – адзін з вынікаў запазычвання. Задачай дадзенай публікацыі з'яўляецца высвятленне матывацыі арабскіх онімаў нябёсаў у Кітабе А. Хасяневіча.

Апавяданне ў легендзе вядзецца ад імені прарока Мухамеда. Назвы нябёсаў таксама гучаць з яго вуснаў. Узнікненне касмонімаў фармальна варта было б звязваць са светабачаннем самога

Прарока, з яго асацыяцыямі і ўражаннямі. Ва ўсякім разе пры іх этымалагізацыі гэта варта ўлічваць. Аднак нельга і недаацэньваць ролі народнай творчасці, вынікі якой маглі быць выкарыстаны аўтарам дадзенай легенды (успомнім сведчанне Г. Мішкінене аб несупадзенні асобных назваў нябёсаў у "літоўскіх" і турэцкіх кітабах).

Першае неба, якое наведвае прарок Мухамед у ходзе свайго незвычайнага падарожжа, называецца *рефе'е* [рафа́]. Указваецца таксама, што яно створана з дыму. Уваход на першае неба зачыняўся варотамі, назва якіх – *хафиъ*: *з диму стварона видзив небо першайе ʼу ки́табе рефе'е име 'адни варота видзив име хафиъ браме вежи 'уси́е из си́ватласи́ц* (100б10–101а1) [З дыму створана першае неба. У кітабе яго называюць Рафа́. Бачыў адны вароты, называюцца Хафіз, аркі, вежы – усе са святла].

Слова *ха́фіз* (حافظ) у арабскай мове полісемантычнае, адно з яго значэнняў – 'чалавек, які ведае на памяць Каран' [2, с. 183]. Тут наўрад ці маецца на ўвазе 'захавальнік Карана' (які захоўвае Каран у сваёй памяці). У гэтым кантэксце больш падыходзіць першае значэнне слова 'які аберагае, які ахоўвае' [2, с. 182]. У назве варот, за якімі знаходзіцца першае неба, адлюстроўваецца *функцыя*, *прызначэнне* варот – імі аберагаецца ўваход на нябёсы. Пагэтаму вароты пільна ахоўваюцца воінствам анёлаў, якім кіраваў Ісмаіл: *пришов джебра'ил 'у варота 'ударив из си́редзини голас пришов хто йест рек йа йест чи ти джебра'ил варота адчини 'увайду исма'ил мувил ведле цебе хто йест скажи мне джебра'ил мувил си́менча нехай табе при мне прарок пахвалноси́ц си́вета* (101а 2–5) [Падышоў Джабраіл, пастукаў у вароты. З сярэдзіны адгукнуліся: Хто тут? Адказаў: Гэта я. Гэта ты, Джабраіл? Вароты адчыні, дазволь увайсці, Ісмаіл. Спытаў [Ісмаіл]: Хто з табою побач, скажы мне? Джабраіл адказаў: Добрая вестка табе: са мною Прарок, дастойны пахвалы].

Але чаму першае неба называецца Рафа́? Вельмі магчыма, што *рефе'е* – ад ар. rafa'a 'павышаць, падымаць, узвышаць', напрыклад, павысіць значэнне чаго-н. і пад. [2, с. 305], 'узвысіць' у чыіх-н. вачах [3, с. 105]. Верагодна, неба, якое Прарок бачыў першым, зрабіла на яго вялікае ўражанне сваімі памерамі, а мабыць, і ўзвысілася ў яго вачах. Гэта, як здаецца, адно з магчымых тлумачэнняў унутранай формы назвы. Даводзіцца толькі прызнаць ужыванне дзеяслова ў якасці оніма нетрадыцыйным сродкам намінацыі.

Другое неба, паводле больш распаўсюджаных усходніх крыніц, было створана з медзі [4, с. 249]. Са сведчаннем у манускрыпце А. Хасяневіча гэта не супадае: *из желаза стварона небо другойе пан бог што 'уробиц будзе гатова наʼуре йест другому небу име* (102а4) [З жалеза створана другое неба. Бог што задумае – будзе гатова. Наура называецца другое неба].

Даследчыкі кітабаў адносяць слова *наʼуре* да арабізмаў – даюць яму традыцыйнае тлумачэнне 'назва другога неба' [5, с. 773]. Тым часам Наура (ناعورة) у арабскай мове мае значэнне 'норыя, (вадзяное) арашальнае кола' [2, с. 813]. Лексема *норыя* ёсць і ў беларускай мове, яна запазычаная і замацавалася ўжо з "навейшым" значэннем 'каўшовы элеватар з радам чарпакоў на рухомым ланцугу для падымання сыпкіх цел, вады і г.д.'.

На другім небе Прарок бачыць незлічоную колькасць анёлаў, у абавязкі якіх уваходзіць назіранне за выкананнем вернікамі тых ці іншых рытуалаў на зямлі. З апавядання мы таксама даведваемся, што Прарок прывітаўся з імі, а яны пакланіліся яму. Вось фактычна і ўсе звесткі, але іх недастаткова, каб растлумачыць назву неба. Магчыма, другое неба нечым выклікала асацыяцыю з вадзяным колам – прыстасаваннем, якое шырока выкарыстоўвалася ў краінах Усходу для ірыгацыі. Аднак дадатковых сведчанняў пра гэта ў тэксце няма. Прызнаць

значэнне 'норыя' ўнутранай формай касмоніма Наура наўрад ці можна, ва ўсякім разе – без дадатковага культурна-моўнага абгрунтавання.

Трэцяе неба, паводле іншых усходніх крыніц, Бог стварыў з серабра, а чацвёртае – з золата. У легендзе з Кітаба Хасяневіча трэцяе неба створана таксама з серабра, а чацвёртае – з дыму. Трэцяе неба называецца *за'ире*, чацвёртае – *мезине*: *трецейа неба пан бог стварив з сребра за'ире име 'а саму зе сребра* (102б2) [Трэцяе неба Бог стварыў са срэбра. Называецца Заіра. Усё са срэбра]; *з диму …пан бог чвартайе неба стварив име мезине* (103а1) [З дыму стварыў Бог чацвёртае неба. Імя [яго] – Мазіна].

Атрымліваецца, што першае і чацвёртае нябёсы створаны з аднаго і таго ж матэрыялу. Яўныя выдаткі, непазбежныя пры шматразовым перапісванні ці перакладзе, а магчыма, гэтая недарэчнасць была ўжо ў нейкім трэцім варыянце легенды. Сумніўна, што дым як будаўнічы матэрыял мае дачыненне хоць бы да аднаго з нябёсаў. Паводле іншых усходніх крыніц, першае неба створана з жалеза.

Што да слоў *за'ире* і *мезине* (верагодны варыянт прачытання: [*за'іра*], [*мазіна*]), якімі называюцца трэцяе і чацвёртае нябёсы, то гэтыя касмонімы таксама арабскага паходжання. Лексема *за'ире* адпавядае ідэі наведвання, што ў арабскай мове перадаецца словам zijara (زيارة) [зійара] 'наведванне, візіт' [2, с. 338], а дзеепрыметнік za'ira (زائرة) [за'іра] мае значэнне (літаральна) 'якая наведвае'. Гэтая форма і выкарыстоўваецца ў якасці касмоніма. Але даводзіцца ўсё ж канстатаваць, што арабская назва неба Заіра значэннем арабізма za'ira (زائرة) 'якая наведвае' або 'наведвальніца' наўрад ці матывуецца.

Арабскае слова *мезине* суадносіцца з ідэяй упрыгажэння, дэкарыравання. Параўн.: ар. zajn 'упрыгожваць, прыбіраць'; ар. zajjana 'упрыгожваць, дэкарыраваць, прыхарошваць' [2, с. 341], а дзеепрыметнік mezina (مزينة) [мазіна] ад гэтага кораня з далучэннем афікса *те-* літаральна абазначае 'якая ўпрыгожана'. Трэба думаць, чацвёртае неба, аздобленае золатам, зрабіла ўражанне на прарока Мухамеда сваёй *упрыгожанасцю*.

Калі ў манускрыпце А. Хасяневіча чацвёртае неба падаецца як створанае з дыму, а не з золата, як у найбольш пашыраных краінах Усходу варыянтах легенды, то ясна, чаму золата аказалася на пятым небе: *патайе неба зе злота йест видзев гори кемене ўće дарагийе камен сафи патего неба име* (109а4) [Пятае неба з золата ёсць. Бачыў [там] горы, камяні – усе дарагія камяні. Пятае неба называецца Сафы].

Назва пятага неба – Сафы. У арабскай мове яно адпавядае слову (صفى) – ар. 'чысты, празрысты, ясны; бязвоблачны (пра неба)' [2, с. 441]. Можна меркаваць, што яно ўразіла Прарока сваім выглядам, было *чыстае*, *яснае*, *бязвоблачнае*, хаця гэтыя характарыстыкі неба ў легендзе не адзначаюцца.

Шостае неба, паводле іншых найбольш распаўсюджаных версій, створана з ізумруду. У легендзе з Кітаба А. Хасяневіча неба называецца Халіса, але назва матэрыялу, з якога створана неба, адсутнічае: *шостайе неба видзев дараги камен брами бакшити ўće з дарагога камене шостага неба име халисе* (109б10–110а1) [На шостым небе бачыў дарагія камяні, брамы, бакшыты – усе з дарагіх камянёў. Называецца шостае неба Халіса].

Тут Прарок бачыць дарагія ўпрыгажэнні, сапраўдныя, якія не з'яўляюцца падробкай. Гэтая акалічнасць магла быць матывацыйнай прыметай назвы, паколькі halis – ар. 'чысты, непадроблены, сапраўдны, шчыры' [2, с. 232]. Шостае неба ў іншых тэкстах кітаба называецца іменна Халіс. Так, у апавяданні "*и теж не йест прийента модлитва ибрагима прароке за ойцем йего*" (145б1), дзе даюцца назвы нябёсаў, шостае неба мае назву *халис*: *шустему небу име йему халис йест* (145б20).

Акрамя гэтага, дарэчы прыгадаць, што цюркскі тэкст рыфмаваны, напісаны вершаванымі двухрадкоўямі, арабскае слова halis магло трансфармавацца аўтарам твора ў Халіса (ім заканчваецца першы радок) для стварэння рыфмы з цюркскім словам ġussa, якім заканчваецца другі радок. У святле гэтага сведчання ёсць падставы лічыць назву Халіс зыходнай, а Халіса – вытворнай.

Сёмае неба, паводле беларускай копіі, створана з дыяменту, г.зн. з алмазу, і носіць імя Фаўка: *ćомайе неба видзев шчирего дийаменту име febke ла'ла* (110а6) [Бачыў сёмае неба – яно з алмазу. Называецца Фаўка].

Як вядома з іншых усходніх крыніц [4, с. 249], сёмае неба створана з рубіну. Корань فوق (ФВК) у арабскай мове мае значэнне 'стаяць вышэй за што-небудзь', а слова *fawqa* мае значэнні 'над', 'вышэй, звыш' і інш. [2, с. 613]. Звязваць паходжанне назвы Фаўка з прыназоўнікамі *над* або *звыш* наўрад ці карэктна. Больш верагодным было б тлумачэнне касмоніма праз слова *fawq* – ар. 'верх, верхняя частка чаго-н.' [2, с. 613]. Іменна сёмае неба і ёсць найвышэйшае, апошняе ў нябеснай іерархіі, якая замацавалася ў касмалагічных уяўленнях мусульман.

Значэнне слова (?) ці яго часткі (?) *ла'ла*, якое напісана следам за словам *febke* ў цюркскай і беларускай частках, выявіць не ўдалося. Уяўляецца, што *ла'ла* – гэта скажэнне нейкага слова.

Заключэнне. У якасці назваў нябёсаў выступаюць арабскія словы розных часцін мовы (дзеяслоў, назоўнікі, а таксама прыметнікі і дзеепрыметнікі, якія ў арабскай мове належаць да назоўнікаў).

Большасць касмонімаў этымалагізуецца, матывацыйныя прыметы назваў пятага (Сафы), шостага (Халіса), сёмага (Фаўка), а таксама з пэўнай агаворкай, чацвёртага (Мазіна) і, магчыма, першага (Рафа) нябёсаў дастаткова празрыстыя. Выбар найменняў у гэтых выпадках абумоўлены галоўным чынам найбольш выразнымі, кідкімі прыметамі, якімі характарызуюцца нябёсы або прадметы, што там знаходзяцца, а таксама ўражаннем наведвальніка і месцам, размяшчэннем аднаго неба адносна другога.

У аснове назвы варотаў (Хафіз), якімі аберагаецца ўваход на першае неба і ўвогуле на нябёсы, адлюстравалася іх асноўная функцыя.

Матывацыйныя прыметы касмонімаў-арабізмаў у назвах трэцяга (Заіра) і асабліва другога (Наура) прасочваюцца з пэўнай доляй дапушчэння, калі не сказаць, што зусім не вытлумачальныя.

Слоўнік

Джабраіл – архангел, на якога Богам была ўскладзена місія перадачы адкрыццяў прарокам. У хрысціянстве – архангел Гаўрыіл.

Ісмаіл – каранічны персанаж, прарок, сын Ібрагіма. Лічыцца прабацькам часткі арабскага этнасу.

Літаратура

1. Мишкинене, Г. Легенда "Мирадж" из Китаба Ивана Луцкевича / Г. Мишкинене, Х. Дургут // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kalbos, kultūros ir raštijos tradicijos. – Vilnius, 2009. – С. 357–375.
   У Кітабе А. Хасяневіча, манускрыпце першай трэці XIX ст., імя аўтара – Хаджы Махмуда – устанаўліваецца толькі па цюркскай частцы, паколькі ў беларускай яно напісана памылкова як "Мухаммед".
2. Баранов, Х.К. Арабско-русский словарь / Х.К. Баранов. – 6-е изд., стереотип. – М.: Русский язык, 1985. – 944 с.
3. Борисов, В.М. Русско-арабский словарь: в 2 т. / В.М. Борисов. – 2-е изд., стереотип., с прил. новых слов. – М.: Русский язык, 1981. – Т. 1: А – О. – 1981. – 640 с.
4. Демидчик, В.П. Памятник белорусской литературы, писанной арабским письмом, и легенда о ночном вознесении Мухаммеда / В.П. Демидчик // Проблемы арабской культуры (Памяти академика И.Ю. Крачковского). – М.: Наука, Главная ре-

дакция восточной литературы, 1987. – С. 238–253.
5. Китаб Ивана Луцкевича: Памятник народной культуры литовских татар / авт.-сост. Г. Мишкинене. – Вильнюс, 2009. – 800 с.

Паступіў у рэдакцыю 12.04.2013 г.

Прыняты ў друк 24.06.2013 г.